Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 38 Вільня, Нядзеля 29 Лістапада 1931 г. Год VII (XV)

# Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

## Беларусы!

**Пры агульнай перапісі ў сераду 9-га сьнежня с. г.** кожны Беларус павінен вымагаць, каб ягонай роднай мовай (папольску — „język ojczysty“) была запісана мова **БЕЛАРУСКАЯ.**

## Слуцкае Паўстаньне.

### *(XI.1920—XI.1931)*

Нямала ёсьць у жыцьці беларускага народу здарэньняў, якія часта маюць гістарычнае значэньне, але якія народ гэты дзеля рожных прычын ня толькі што належна ня выкарыстоўвае, але аб якіх проста забываецца. Да гэтакіх здарэньняў бясспрэчна належа Слуцкае Паўстаньне, якога сёлета ў лістападзе месяцы прыпадаюць 11-ыя ўгодкі, а якое беларускаму грамадзянству і народу дужа мала ведама. Апісаць гэтае беларускае паўстаньне, рэч ясная, немагчыма ў газэтным артыкуле, на гэта патрэбная адумысловая монографія, якой гэны гістарычны факт, у што верым, у сваім часе напэўна дачакаецца. З свайго-ж боку мы тут аб Слуцкім Паўстаньні скажам толькі некалькі агульных думак.

Случчына — гэта беларуская ўраджайная краіна Меншчыны, паложана між вытокамі Нёмана і Бярэзіны. Заможныя агулам Случчакі здаўна слылі свэей культурнасьцяй, бо мелі магчымасьць, а што йдзе ў сьлед з ёй — і ахвоту да школы, да асьветы. Пашыраная ў народзе Случчыны граматнасьць і асьвета спрыялі, як ня трэба лепш, так-жа і пашырэньню там беларускай народнай сьведамасьці, якая ў Случчыне апошняга часу зазначалася бадай яскравей, як у іншых кутках беларускай зямлі. З Случчыны, між многімі іншымі заслужанымі беларусамі, вышаў і слаўны беларускі паэт Якуб Колас.

Яшчэ ў 1918 г., пад канец расейскай рэвалюцыі і нямецкай акупацыі беларускіх зямель, у Слуцку паўстаў Беларускі Нацыянальны Камітэт, які, як на тыя часы, шырока вёў беларускую культурную і палітычную працу.

Пад канец 1918 г., па немцах, Случчыну займаюць бальшавікі, а пад канец лета 1919 г.—палякі. У 1920 г. палякоў выганяюць бальшавікі, пасьля якіх у Случчыну ўзноў варочаюцца палякі. Праз увесь гэты час, асабліва-ж падчас палякоў, Бел. Нац. К-т у Слуцку ня спыняе сваей дзейнасьці.

Польская армія, адбіўшы атак арміі бальшавіцкай у 1920 г., затрымалася ўзноў на беларускіх землях аж пад Менскам. Бальшавікі ня чуліся на сіле ваяваць далей з палякамі і запрапанавалі мірныя перагаворы, якія і пачаліся ўвосень таго-ж 1920 г. ў Рызе. Падчас перагавораў яшчэ ў гэтым-жа годзе было пастаноўлена Слуцк і ўсю Случчыну аддаць бальшавікам. Дзеля гэтага польскае войска пакінула Случчыну і адышло на лінію, прадбачаную Расейскім дагаворам.

У гэтым часе ў Слуцку існавала і працавала Рада Случчыны, выбраная на зьезьдзе ў Слуцку 15.XI.1920 г., пры ўчасьці 107 дэлегатаў.

Пакідаючы Слуцк, палякі пакінулі Радзе Случчыны 500 стрэльбаў і крыху набояў дзеля самаабароны.

Случчакі пастанавілі гэны момант выкарыстаць для вольнай Беларусі. Калі ў канцы лістапада 1920 г. Случчыну, згодна з мірнымі бальшавіцка-польскімі пастановамі, пачало займаць войска бальшавіцкае, краіна гэта была ў руках беларускіх паўстанцаў, якія аружна баранілі ад бальшавікоў сваю краіну.

Паўстаньнем кіравала Рада Случчыны. Яна да бальшавіцкай Рады Народных Камісараў выслала ноту, пратэстуючы проціў акупацыі бальшавікамі беларускіх зямель і паклікаючыся пры гэтым на пастанову Рады Беларускай Народнай Рэспублікі аб незалежнасьці Беларусі з дня 25.III.1918 г. Замест адказу на гэтую ноту беларускіх паўстанцаў бальшавікі аружна займалі вызначаныя ім у Рызе беларускія тэрыторыі, спатыкаючы па ўсей Случчыне аружнае спраціўленьне паўстанцаў, якія мужна змагаліся пад клічам— за вольную і незалежную Беларусь. Барацьбу гэту вялі два паўстанчыя палкі — Слуцкі і Грозаўскі, якія станавілі паўстанчую брыгаду.

Беларускае паўстанчае войска мужна змагалася з бальшавікамі праз лістапад і сьнежань 1920 г. і ўрэшце яно ўступіла прад вялізарнай сілай збройнай бальшавіцкай і галоўныя яго сілы змушаны былі ўцякаць за польскую лінію. На польскай тэрыторыі беларускія ваякі былі разброены і інтэрнаваны. На тэрыторыі Случчыны, ужо пад бальшавікамі, асталіся толькі невялікія аддзелы паўстанцаў, якія яшчэ і далей вялі партызанскую вайну з бальшавікамі.

Проціў Слуцкага Паўстаньня, як паўстаньня беларускага народнага і незалежніцкага, часта можна пачуць закід, што яно было арганізавана палякамі для барацьбы з бальшавікамі і агулам для польскіх палітычных мэтаў на беларускіх землях. Вось-жа факт пэўнай (дагэтуль нявыясьненай) прычаснасьці да гэтай справы польскага генэральнага штабу і польскай палітыкі агулам, астаецца фактам. Факт гэтай польскай прычаснасьці да Слуцкага Паўстаньня сьцьвярджае так-жа і тое, што камандаваньне паўстанскае было ў сьціслым кантакце з так званай Беларускай Найвышэйшай Радай, якая трымалася польскай ор'ентацыі, бо паўстала з апазыцыі да беларускага ўраду Ластоўскага, выбранага Радай Бел. Народнай Рэспублікі ў сьнежні месяцы 1919 г. ў Менску.

Нягледзячы аднак на гэта, факт астаецца так-жа фактам, што Слуцкія паўстанцы шчыра йшлі за незалежнасьць Беларусі і за гэты іменна вялікі ідэал пралівалі сваю беларускую кроў. Факт польскага ўплыву (мера якога дагэтуль — паўтараем — нявыясьненая) на слуцкае паўстаньне ня можа прыцьміць усей велічы чыну паўстанцаў за волю і долю Беларусі, якія ў сваім імкненьні да гэтага вялікага ідэалу мелі поўнае права шукаць апоры на тэй сіле, якую сулілі ім тагочасныя палітычныя варункі. Значэньне гэтага чыну сапраўды гістарычнае. Беларуская кроў, пралітая на родных палёх Случчыны, ня зьгіне марна і зродзіць некалі тыя ідэалы, за якія яна была праліта.

## З газэт.

### Важны юбілей.

„Chryścijanskaja Dumka“ у № 17 сёл. г. пад загалоўкам „10-ыя ўгодкі набажэнстваў для Беларусаў у Віленскім касьцеле сьв. Мікалая“, апісаўшы ўсе тыя захады, дзякуючы якім Беларусы каталікі здабылі магчымасьць маліцца ў успомненым літоўскім касьцеле з ужываньнем беларускай мовы, гэтак канчае гэны артыкул:

„Але трэба сьцьвердзіць, што гэткае палажэньне касьцельнага жыцьця беларусаў каталікоў ня ёсьць здаваляючае. Справа ў тым, што беларусы-каталікі, якіх лік у Вільні хоць паволі, але стала прыбывае, каб належна выконваць свае рэлігійныя абавязкі, мусяць для гэтага мець свой асобны касьцёл, з сваім беларускім духавенствам. Прасьцей кажучы, у Вільні ўжо адчуваецца патрэба арганізаванага парафіяльнага жыцьця для беларусаў-каталікоў хоць-бы, пакульшто, у якім і невялічкім касьцёлку. Прычыны такой патрэбы ясныя, а на наш пагляд, найважнейшая з іх тая, што многія беларусы каталікі, відзячы сябе ў жыцьці рэлігійна-касьцельным пакрыўджанымі, часта цалком адхіляюцца ад Касьцёла і, што йшчэ горш, часам аткрыта ўступаюць у рады яго ворагаў.

З гэтай справай беларусы каталікі неаднакратна ўжо зварочваліся да Я. Э. Арцыбіскупа, але, нажаль, дагэтуль надарэмна. Трэба аднак спадзявацца, што Арцыпастыр да гэтых сапраўды слушных патрэб нашых аднясецца прыхільна і ў меру магчымасьці здаволіць іх.

Вось-жа сьвяткуючы 10-ыя ўгодкі набажэнстваў для беларусаў у касьцеле сьв. Мікалая, набажэнстваў, казаў-бы, прыпадковых і з ласкі гаспадароў гэнага касьцёла, астаецца беларусам каталіком перадусім жадаць, каб ужо пачатак другога дзесяцілецьця прынёс ім магчымасьць жыцьця рэлігійнага арганізаванага ў асобную беларускаю парафію, з асобным для беларусаў касьцёлам“.

Ад сябе можам толькі пасьведчыць слушнасьць думак „Chr. Dumki“, але мусім адначасна сказаць, што няма каму іх слухаць іісьці ім на спатканьне. Духовыя патрэбы беларусаў каталікоў, у сэрцы арцыб. Ялбжыкоўскага, на вялікі жаль, не знаходзяць належнага спачуцьця.

### Больш развагі і аб'ектыўнасьці.

Грам. Акінчыц у сваім „Голасе Праўды“ ўжо некалькі разоў пісаў аб беларускіх гімназіях, на што мы ўжо ў свой час зварочвалі ўвагу. У апошнім (5) нумары „Г. Праўды“ гр. Акінчыц ізноў падымае справу бел. гімназіяў і дзівіцца, чаму гэта ў іх так мала вучняў, тады, калі ў такой расейскай гімназіі ў Берасьці аж 600 вучняў! Ня ўходзячы ў спрэчку з гр. Акінчыцам у іншых справах, датычачых бел. гімназіяў, дзівімся, што гр. Акінчыц ня ведае таго, што ў расейскую гімназію ў Берасьці пасылаюць сваіх дзяцей усе праваслаўныя сьвяшчэньнікі, якіх на Палесьсі вельмі многа і што расейцы—гэта цяпер найбольш чыноўнікі, большыя ўласьнікі ды наагул людзі заможныя. А беларусы што? Адны бадай сяляне, якія цяпер перажываюць страшэнную галіту. А дзе ў вас свая заможная кляса? Дзе чыноўнікі, духавенства? Дык нашто пісаць пусьцячыну аб беларускіх гімназіях? Пара разважней глядзець на беларускія справы і разглядаць іх аб'ектыўна.

### Яшчэ аб „палешуцкай“ народнасьці.

Мы ўжо пісалі (гл. „Б. Крыніца“ № 5 с. г. „Палескі клін“), што польская палітыка імкнецца стварыць нейкую новую „палешуцкую“ народнасьць, каб гэтым убіць клін па-

між беларусамі і ўкраінцамі. Цяпер і польскія школьныя ўлады сталі на гэтакі самы грунт, як гэта відаць з карэспандэнцыі з Варшавы, зьмешчанай у газэце „Сегодня“ (14.XI. с. г.). У гэтай карэспандэнцыі пішацца, што куратар Палескага школьнага вокругу Погожэльскі выслаў да Пінскага правасл. арцыбіскупа пісьмо, у каторым, пералічваючы насяляючыя Палесьсе народнасьці, называе так-жа нейкі народ „палешуцкі“. Асноўваючыся на тым, што паводле конституцыі закон Божы мусіць быць выкладаны ў роднай (бацькаўскай) мове(!), куратар загадвае, каб правасл. духавенства выкладала рэлігію ў мясцовых мовах: палешуцкай (на першым месцы!), украінскай і беларускай. У канцы свайго пісьма куратар сьцьвярджае, што дзеля таго, што правасл. духавенства ня знае ніводнай з гэтых моваў, дык загадывае выкладаць рэлігію для праваслаўных дзяцей у мове дзяржаўнай, гэта значыць: папольску.

Прызнаёмся, што мы такой лёгікі ў вывадах і такіх сылёгізмаў яшчэ ня чулі! Тут ня толькі творыцца новая палешуцкая народнасьць, якой мовы сапраўды ніхто ня знае, але на падставе гэтага нязнаньня загадваецца вучыць папольску. Лепш прыдумаць трудна! Тут п. Погожэльскі сапраўды пабіў рэкорд у вынаходах. „Лепшага“ куратара на Палесьсе трудна было знайсьці!

### І яны прызналі

„Kur. Warsz.“ ў № 320 абгаварывае пашырэньне ўплываў Літвы ў Прыбалтыцы і канчае свае разважаньні гэтак:

„да здабыткаў літоўскай экспансіі можна залічыць утварэньне саюзу балтыцкай прэсы, заснаваньне т-ва літоўска-эстонскага збліжэньня і арганізаваньне супольнай літоўска-латыска-эстонскай акадэміі мастацтва“.

а.

## З Беларускага жыцьця

**Зьезд Б.Х.Д.** вызначаны на 5 сьнежня с. г. адкладаецца на час пазьнейшы з тае прычыны, што адміністрацыйныя ўлады да гэтай пары ня выдалі яшчэ дазволу.

**Адкрыцьцё пачатковай беларускай школы ў Шаўлянах.** Яшчэ сёлета зачыненая бел. школа ў Шаўлянях Браслаўскага пав., з прычыны незацьверджаньня шк. інспэктарам вучыцелькі, нанова адчыняецца, бо шк. Куратар пастанову інспэктара скасаваў і вучыцельку Булыгаву зацьвердзіў. Школа гэта ўтрымліваецца Бел. Інстытутам Гасп. і Культуры.

**Лекцыя.** У нядзелю 29-га лістапада а гадз. 16-й, у памешканьні Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Вільні, Людвісарская вул. 1—19, старшыня Віленскага Аддзелу Бел. Інстытуту Г. і К. інж. Ад. Клімовіч прачытае лекцыю з цыклю „Пазнайма Вільню!“ на тэму: „Вільня як культурна-гістарычны цэнтр беларускіх земляў.“

Уваход на лекцыю бясплатны.

**Агульны сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту.** Дня 22 г. м. адбыўся агульны сход Бел. Нац. К-ту, на якім разгледжаны і прыняты да ведама пастановы Прэзыдыюму Нац. К-ту за час ад апошняга агульнага сходу К-ту. На гэтым сходзе Камітэт, разгледзіўшы распачатую Прэзыдыюмам акцыю помачы беларускаму студэнству, зацьвердзіў сэкцыю Б.Н.К-ту дзеля арганізацыі „Стыпэндыяльнага фонду для беларускага студэнства,“ а так-жа пацьвердзіў рэгулямін гэтай сэкцыі, апрацаваны Прэзыдыюмам К-ту. Рэгулямін гэты друкуем у гэтым нумары. Апрача гэтага, агульны сход К-ту выбраў Рэвізыйную Камісію.

**Сэкцыя „Стыпэндыяльнага фонду для беларускага студэнства Бел. Нац. К-ту** складаецца з гэткіх асоб: старшыня — інж. А. Клімовіч, скарбнік—пасол Ф. Ярэміч, сэкрэтар—б. сэнатар В. Багдановіч. Сэкцыя гэта распачала ўжо сваю дзейнасьць і падае вынікі сваей працы, як справаздачу, якую зьмяшчаем у гэтым нумары.

**Антон Луцкевіч сам аб сабе.** „Называюся Антон Луцкевіч, 45 г., радзіўся ў Шаўлях Ковенскай зямлі,—па нацыянальнасьці — беларус-паляк“. Гэтак, паводле „Слова Праўды“ з дня 21.XI. с. г., сазнаваў Антон Луцкевіч дня 12 кастрычніка 1927 г. перад польскім судовым сьледавацелям Падоскім і гэтак запісана ў судовых актах „Грамады“ т. IV— F на бачыне 186-ай.

Тымчасам без паясьненьняў!

### З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

**Адкрыцьцё рабочага падрыхтоўчага аддзяленьня асьпірантуры пры Бел. Акадэміі Навук.** Нядаўна была адкрыта так зв. рабочая асьпірантура пры Бел. Акадэміі Навук для падгатоўкі „пралетарскіх навуковых кадраў“ на месца сасланых заслужаных бел. культурных дзеячоў. Цяпер чуецца ў Сав. Беларусі вялікі недахоп навуковых сілаў амаль ува ўсіх галінах ведаў—як кажа прэзыдэнт Б. А. Н. Горын (Зьвязда 5.XI. г. г.). (Цікава, ці Горын сам зьяўляецца навуковай сілай, бо ані ў беларускіх навуковых кругох, ані ў расейскіх ягонае прозьвішча было дагэтуль зусім нязнанае — Рэд.)

**Уладары Сав. Беларусі.** „Зьвязда (10. XI г.г.) апісваючы сьвяткаваньне ў Менску 14-ых угодкаў кастрычнікавай (камуністычнай) рэвалюцыі ў Расеі падае прозьвішчы асоб, якія выступалі з прамовамі, у гэтакім парадку: сэкрэтары Ц. К. Кам Партыі Беларусі Гей і Шаранговіч, старшыня Сав. Нар. Камісараў Галадзед, старшыня Ц.В.К. Б.С.С.Р. Чарвякоў, камандуючы вайскамі Б. Ваеннай Акругі Убарэвіч і інш. Ведама, што ўсе гэтыя „уладары“ падлеглыя ува ўсім Маскве і яе дыктатару—Сталіну.

## З Літоўскага жыцьця.

**Прадстаўнік Апостальскай Сталіцы ў Літве.** Паводле апошніх вестак у незалежнай Літве прадстаўніком ад Апостальскай Сталіцы мае быць нунцый Ротто. З гэтага відаць, што непаразуменьні між урадам і Апост. Сталіцай зьліквідаваны.

**Вальдэмарас аб польска літоўскіх адносінах выдае кніжку.** „Кур Віл.“ падае, што б. літоўскі прэм'ер праф. Вальдэмарас цяпер прабывае ў Парыжу і заняты выданьнем кніжкі аб польска-літоўскіх адносінах.

## З Польшчы.

**Адміністрацыйны падзел Польшчы.** Кодыфікацыйная камісія ўжо прыгатавала праект новага адміністрацыйнага падзелу Польшчы і перадала на разгляд Радзе Міністраў. Паводле гэтага праекту мае быць зьменшаны лік ваяводзтваў з 17 на 12 а так-жа зьменшаны і лік паветаў.

**Вялікі судовы працэс.** Прад радомскім судом у Конску пачаўся вялікі судовы працэс за першамайскія забурэньні На гэты суд выклікана 120 сьведкаў.

**Новы карны кодэкс.** У Сойм падана праект новага карнага кодэксу на ўсю Польшчу. Паводле гэтага праекту, сьведка не зьявіўшыся на суд бяз важнай для перашкоды прычыны, адказвае матэр'яльна за кошт адкладаньня суду.

**Менская М. Т. С.** (машына — трактарная станцыя) — **могілкі трактараў** — пад такім загалоўкам „Зьвязда“ (10.XI.) апісвае парадкі на менскай станцыі. „Паводле пляну Менская М. Т. С. павінна была ўзараць на зябліва 5.700 га, а ўзарала на 9 XI толькі 3.200 га.“ Прычынай гэтага адставаньня ў рабоце былі непарадкі на М. Т. С. і неахайныя адносіны да трактараў абслугоўваючага пэрсоналу, якія прывялі да таго, што з 32 трактараў 15 знаходзіцца ў рэмонце.“

Калі ў цэнтральнай машына — трактарнай станцыі гэтак дзеецца, то што гаварыць аб правінцыі? А на правінцыі дзеецца так: у Койданаўскай М. Т. С. (першая, якая паўстала ў Б.С.С.Р.) з 44 трактараў, працуе толькі 3, Церахаўскай—з 30 толькі 10, Смаленскай —з 42 толькі 12 і г. д.

**Адгрузка бульбы Ленінграду** ў Б.С.С.Р. не ўдалася. Некаторыя раёны, як напр. Полацкі, Плешчаніцкі і інш. далі больш чым трэба, а іншыя, як Лебчыцкі, Чуваскі далі толькі каля 20 проц. вызначанай бульбы. 2 лістапада па Б.С.С.Р., з паданых пад бульбу вагонаў, 123 адпраўлены недагружанымі. „Вінаваты ў гэтым калхозная сыстэма і сэльсаветы, яны ня прывезьлі бульбы“ — кажуць загатоўшчыкі. („Сав. Б.“ 4.XI г. г.)

## З жыцьця Беларускага Народу ў Польшчы.

### IV. Пасьляграмадаўскі пэрыод (1927—1931). Ліквідацыя „Грамады“ польскімі ўладамі і яе дыфэрэнцыяцыя.

(Працяг, глядзі „Б. Кр.“ № 37)

Пераглядаючы гадавікі сельсаюзьніцкай і хадэцкай пресы, яшчэ адзін факт кідаецца ў вочы — гэта доўгае маўчаньне аб характары і кірунку „Грамады,“ да таго, што праз нейкі час здавалася, што сярод беларусаў далей існуе адзіны нацыянальны фронт... Рабілася гэта ў імя „дабра“ беларускага народу, спадзяючыся, што можа некалі ізноў наступіць у беларускім народзе едвасьць. Толькі на пачатку 1926 году „Бел. Крыніца“ № 1. 26г.) адважылася напісаць, з мэтай паінфармаваньня сваіх чытачоў, аб падзеле і аб розных палітычных кірунках у беларускім грамадзянстве. Аб „Грамадзе“ і яе кірунку пісалася дaслоўна так: „створаная нядаўна Бел. сялянска-работніцкая Грамада з п. Тарашкевічам на чале, якая разам з „Незалежнай партыяй Хлопскай“ у сваей ідэолёгіі і кірунку прыбліжаецца да Маскоўскага прававерная камунізму і сялянскага камуністычнага інтэрнацыяналу.“ І гэту вестку „Б. Крыніца“ падала тагды, калі ўся польская прэса пісала аб сапраўдным характары „Грамады“ і калі сам Тарашкевіч заяўляў з соймавай трыбуны аб неабходнасьці сацыяльнай рэвалюцыі... Гэтая вестка, падаеная проста такі з публіцыстычнага абавязку, выклікала цэлую буру ў грамадаўскай прэсе. Абзывалі яе даносам польскім уладам на „Грамаду“ і іншай дэмагогічнай лаянкай. З гэтага відаць, якія цяжкія абавязкі ўскладалі грамадаўцы на сваіх палітычных праціўнікаў — хадэкаў і сельсаюзьнікаў: ня маеце права пісаць аб нас праўды, бо гэта будзе данос; ня маеце права прасьцерагаць свайго грамадзянства аб камуністычнай небясьпецы, бо і гэта будзе данос...

Але і пасьля гэтага яшчэ родзяцца ў галовах лепшых беларусаў думкі спыніць гэту вечную грызьню паміж адзіным дагэтуль і згодным бел. грамадзянствам і стварыць калі ўжо не агульна беларускі нацыянальны фронт, то прынамсі агульна-беларускі выбарны суд чэсьці, каб гэты суд вырашаў усе спрэчкі паміж беларусамі (гл. „Б. Крыніца“ № 1, 1927). Аднак і гэты праект, які выйшаў з радоў БХД, астаўся крыкам галосячага у пустыні — на яго ніхто з грамадаўскіх дзеячоў не адгукнуўся! Тагды, пачакаўшы з паўтара месяца, „Б. Крыніца“ (№ 8, 1927) пісала, што на перашкодзе да агульна-бел. „міравога“ суду ёсьць „пазычаная з усходу прынцыповасьць: ніякіх кампрамісаў і згодніцтва з другімі партыямі і інакш думаючымі людзьмі. Партыя, якая выпісала на сваім сьцягу дыктатуру, ня можа йсьці на ніякія „міравыя.“

Пасьля гэтага мы ўжо ня бачым спроб да нейкага паразуменьня, падзел ідзе далей і прыводзіць да стварэньня другога Бел. Нацыянальнага Камітэту. Аб гэтым так піша „Б. Крыніца“ (№ 28, 1927 г.): „Беларускі Нац. Камітэт ад часу, як папаў пад уплывы зьліквідаванай калісь „Грамады“, перастаў быць рэпрэзэнтантам усіх беларусаў і да апошняга часу, у працягу больш як году, не сазваў ані аднаго агульнага сабраньня, нягледзячы на тое, што прадстаўнікі некаторых беларускіх арганізацыяў аб гэтым прэзыдыум Камітэту ня раз прасілі. Дзеля гэтага сябры Камітэту Бел. Хр. Дэмакрацыі і Сял. Саюзу, апіраючыся на законных асновах, запрасілі прадстаўнікоў усіх арганізацыяў і ўстановаў у Вільні на агульны сход, які адбыўся 2 ліпня 1927 г. З 13 запрошаных установаў і партыяў зьявіліся на сход прадстаўнікі толькі ад наступных: 1) Беларускага Пас. Клюбу, 2) Бел. Хр. Дэмакрацыі, 3) Бел. Сял. Саюзу, 4) Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, 5) Т-ва „Пагоня,“ 6) Беларускага каталіцкага духавенства і 7) Бел. друкарні ім. Фр. Скарыны. Па сьцьверджаньні мандатаў выясьнілася, што зьявілася 15 дэлегатаў з ліку запрошаных 27, дзеля чаго

## З заграніцы.

**Конституцыя Індыі.** Мэкдональд маецца ўтварыць камітэт, якому даручыць апрацаваньне конституцыі Індыі.

**Амэрыка і Італія йдуць разам на фронт разаружэньня.** Урадавыя адведзіны італьянскім міністрам Грандзі Зл. Шт. Амэрыкі ужо закончыліся. Мін. Грандзі, як падаюць газэты, перакананы, што Зл. Шт. Амэрыкі і Італія будуць разам ісьці па лініі разаружэньня на канфэрэнцыі дзеля разбраеньня, якая адбудзецца ў лютым 1932 году.

**Новае банкруцтва ў Нямеччыне.** Бэрлінскі гандлёвы і зямельны банк абʼявіў банкруцтва. Ад гэтага банкруцтва пацярпела 36 тысяч кліентаў, якія мелі ў банку свае ўклады. Адначасна спынілі выплату Крэдытовы Банк у Брэмэ і Рамесьлены Банк у Трыеры.

**Суд над палякамі ў Латвіі.** Акружны суд у Дзьвінску засудзіў 14 асоб палякоў, якія ў часе латыскага нябажэнства ў Ілукшце перашкаджалі ў набажэнстве пяяньнем папольску, на кару арышту ад 5-цёх тыдняў да 2-ух месяцаў.

## Усячына.

**Хабарнікаў, спэкулянтаў і ўсялякіх ашуканцаў трэба выганяць.** Прэзыдэнт Чэхаславацкай рэспублікі Масарык у сваей прамове з нагоды Нацыянальнага сьвята сказаў, што ў часе тварэньня Чэхаславацкай дзяржавы напэзла ў дзяржаўныя ўстановы шмат людзей, якія ані марально, ані паводле асьветы не дарасьлі да свайго заданьня, а так-жа людзі, якія выкарыстоўваюць сваё становішча дзеля асабістай нажывы. Хабарнікаў, спэкулянтаў і ўсялякіх ашуканцаў трэба выганяць, тымболып, калі яны бяруць учасьце ў жыцьці палітычным. Грамадзянства вымагае ад сваіх прадстаўнікоў чэснай працы, але ёсьць людзі, што публічнае жыцьцё дэмаралізуюць і анархізуюць. Ня толькі палітыка, але і ўсё жыцьцё мусіць апірацца на асновах чэснасьці. Цяпер замала рабіць палітыку, трэба мець адпаведную веду і чэсны характар.

**У 17 дзяржавах 16 000 000 безработных.** Сусьветны гаспадарчы крызыс, які ахапіў увесь сьвет, мільёны людзей пазбавіў працы і спосабаў да жыцьця. У 17 дзяржавах гэткіх няшчасных бяз працы людзей налічваецца аж 15.814-208 асоб, а іменна: У Нямеччыне — 4,104,000, — Англіі—2,813,163 Італіі — 723,909, Польшчы — 251.310, Чэхаславацыі — 200 908, Аўстрыі — 196 321, Бэльгіі 175,192, Галяндыі —63,952, Францыі — 53,673, Новай Зэляндыі — 48,670, Швэцыі — 44,261, Даніі — 36,100, Канадзе—32,400, Вугры — 29.412, Норвэгіі — 22,431, Швайцарыі — 18,506 і ў Зл. Шт. Амэрыкі—7.000.000 безработных.

## Да нас пішуць.

### КАРОТКІЯ ВЕСТКІ З НАШАЙ ВАКОЛІЦЫ.

Ёдзкая вол. Браслаўскага пав. Аб той бядзе і галіце, якая штодзень дакучае нашым сялянам цяпер пісаць ня буду. Надаела яна нашым вяскоўцам, як горкая рэдзька і кожны селянін аб гэтай штодзеннай бядзе стараецца хоць раз у тыдзень забыцца. Дык ня буду разводзіцца аб гэтай бядзе і я, а напішу лепш аб сім тым іншым патроху.

Як ведама, урад спыніў хутарызацыю аж на 7 гадоў, а прычынай гэтага таксама бяда ці выразьней кажучы, беднота — грошай няма. Але каб не падумалі сяляне, што аб іх урад ня турбуецца зямельная ўправа загадала прымусовую мэліорацыю. Гэтая ж мэліорацыя, паводле пляну, палягае на капаньні равоў на нізкіх мясцох. Праводзіць я маюць інжынеры, якім сяляне мусяць даць кватэру, фурманкі і работнікаў. Пэўне-ж, не абойдзецца і бяз платы за мэліорацыю. Нашы вяскоўцы змушаны галітой і безграшоўем баяцца і гэтай „бясплатнай" мэліорацыі, каб за яе ня прышлося часамі дорага заплаціць.

У нядзелю 15 г. м. у в. Шаўлянях маскалькі, правакуючы нашую моладзь, пачалі страляць, выкрыкваючы непрызвытыя словы. Але наша беларуская моладзь паказалася больш культурнай ад маскалькоў і на іх правакацыю не зьвярнула ніякай увагі. Слушна, на благія паступкі ўвагі зварочваць ня варта.

У нас ужо прыгатаўляюцца да агульнай перапісі насельніцтва. Сьпісоўшчыкамі вызначаны польскія вучыцялі і вучыцелькі. Нам беларусам трэба ў часе гэтай перапісі, якая адбудзецца 9 сьнежня, падаваць, што наша родная мова, ці як папольску „ензык ойчысты" ёсьць мова беларуская

Грышка.

## З краю.

**Пажары.** Паводле ўрадавага абліченьня ў мінулым годзе ў Віленскім ваяводзтве было 418 пажараў. Згарэла 116 хатаў, 68 гаспадарскіх будынкаў, 14 лазьняў, 18 стайняў і 42 гумны з збожжам.

У Браслаўскім пав. у в. Буеўшчына 19 м. м. згарэлі 4 гумны з збожжам, а ў в. Сасноўцы Дзісьненскага пав. 26 м. м. згарэлі 4 хаты і 4 гумны з збожжам.

**Ваўкі нападаюць.** Дня 9 мін. м. стада ваўкоў напала на двор Зайнова ў Браслаўскім пав. і задушылі 20 авец.

*ГРАМАДЗЯНЕ!*

*Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!*

*Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!*

## Пісьмо ў Рэдакцыю

Вельмі Паважаны

Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва прашу не адмовіць надрукаваць у „Беларускай Крыніцы" наступнае.

У апошнім нумары „Слова Праўды" зьмешчана зложанае на працэсе Грамады былым дырэктарам Беларускага Коопэратыўнага Банку гр. Астроўскім паясьненьне аб дзейнасьці Банку. У гэтым паясьненьні названа і мае прозьвішча, з чаго Рэдакцыя „Слова Праўды" робіць свае тэндэнцыйныя вывады і прыпушчэньні. У сувязі з гэтым паясьняю,

1. Што больш менш значныя сумы касавае гатоўкі, з-за атсутнасьці ў памешканьні Банку стоража, ці якое-небудзь іншае асобы, часам забіраліся кім-небудзь з сябрoў Управы Банку для перахову на ноч дамоў, дык праз гэта ня толькі нішто не пагражала справам Банку і яго кліентам, а якраз гэтым інтарэсы Банку і кліентаў забясьпечваліся.

Калі гэты, з фармальнага боку можа і ня зусім праўны, спосаб управа змушана была ўжываць, то выключна таму, што становішча Беларускага Банку ў першы год па яго заснаваньні не дазваляла з эканамічных прычынаў набыць добрую агнетрывалую касу і наняць стоража.

Ня так даўно ў польскай прэсе было паладзена, што на адзін з правінцыяльных аддзелаў пошты уначы напалі бандыты. У касе яны знайшлі толькі некалькі залатовак. Сапраўдная гатоўка касы была ўратавана толькі дзякуючы таму, што кіраўнік пошты на ноч забраў яе да сваей кватэры. Ніхто не падумаў абвінаваціць за гэта кіраўніка пошты, а прэса пісала аб ім, як аб прыкладным урадоўцу.

2. У судовых актах справы аб працэсе Грамады знаходзіцца і мае падрабязнае пакязаньне аб дзейнасьці Банку, і калі-б Рэдакцыя „Слова Праўды" пацікавілася ім, то пераканалася-б, што ў справе перахову тымі ці іншымі асобамі грошаў у Банку на бягучых рахунках і тэрміновых узносах яно зусім супярэчна з паказаньнем гр. Астроўскага.

Мае паказаньне было сьцьверджана на судзе як маімі сьведкамі, так і экспэртызай, і таму адказным за паясьненьне Дыр. Астроўскага я быць не магу, а вывады і прыпушчэньні „Слова Праўды" лічу беспадстаўнымі і тэндэнцыйнымі

З пашанаю сьвяшчэньнік **А. Коўш.**

У суботу 5-га сьнежня Бацькаўскі Камітэт Віленскай Беларускай Гімназіі ладзіць

## Канцэрт-Вечарыну

на карысьць незаможных вучняў гімназіі. Канцэрт-вечарына адбудзецца ў салі гімназіі (Вострабрамская 9). Пачатак а гадз. 8-ай.

---

сабраньне, як правамоцнае, зрабіла перавыбары, у каторых сэнатар Багдановіч выбраны за старшыню, пасол Яраміч і грам. Каруза на якого заступнікаў".

„Дзеля таго — піша далей „Б. Крыніца" — што прадстаўнікі некаторых беларускіх арганізацыяў, хоць былі запрошаны, не зьявіліся, агульны сход паставіў даручыць прэзыдыуму Б. Нац. Камітэту зьвярнуцца да гэных арганізацыяў і ўстановаў з прапазыцыяй прыслаць сваіх прадстаўнікоў. Каб прыдаць абноўленаму Нацыянальнаму Камітэту характар поўнага прадстаўніцтва ўсіх беларускіх партыяў і ўстановаў і ўхіліцца ад якойколечы аднастароннасьці, сабраньне 2 ліпня не адкідывае магчымасьці скліканьне новае агульнае сабраньне, калі гэтага не ўваішоўшыя, а цяпер запрошаныя ў Нац. Камітэт установы і партыі будуць дамагацца."

Як бачым, да стварэньня „другога" Б. Нац. Камітэту прычыніўся той факт, што прэзыдыюм яго, апанаванае „Грамадою," болей году не хацела склікаць агульнага сходу Камітэту, хоць сябры гэтага Камітэту, увакодзячыя ад БХД і Сельсаюзу гэтага няраз дамагаліся і баяньнё з іх стараны, каб „Грамада" не папраўдаквала нацыянальных інтарэсаў беларускага народу інтэрнацыянальным клічам, выходзячым з Масквы. З другога боку сход новага Камітэту даў магчымасьць тым з грамадаўскіх арганізацыяў, якія йшчэ не паддаліся цалком камуністычным уплывам, увайсьці ў абноўлены Б. Нац. Камітэт. Аднак „Грамада" адкінула гэту прапазыцыю і ня толькі не ўвайшла ў „новы" Нац. Камітэт, але нават не паддзержывала „старога," каторы, як нялюбая камуністам нацыянальная установа, зьліквідаваўся сам сабою і цяпер ня існуе. Традыцыі даўнейшага Нац. Камітэту, абʼядноўваючага ўсе нацыянальныя беларускія групы, пераняў абноўлены Б. Нац. Камітэт, у які увайшлі тры вышэй успомненыя бел. партыі: БХД, Сельсаюз і Правасл. Дэм. Абʼяднаньне свя. Багдановіча.

Дзеля гэтых самых прычын нацыянальнага характару дзеячы „Грамады" не маглі супрацоўнічаць у журнале „Natio," бо якжа-ж яны маглі супрацоўнічаць у такой „архі-нацыяналістычнай" часопісі, абʼядноўваючай усе нацыянальныя меншасьцёвыя групы ў Польшчы? Што сказаў-бы на гэта ўсходні „дзядзька"? А ўсходні „дзядзька" глядзеў на „Natio", як на твор злучанага буржуазнага нацыяналізму і затым аднасіўся да яго дужа крытычна.

Якое-ж было значэньне „Грамады" ў бел. адраджэнскім руху?

Цяпер, глянуўшы здалёку на дзейнасьць „Грамады," беларускія нацыянальныя дзеячы бачаць усю шкоднасьць яе для беларускага народу. Яна ня была незалежнай беларускай арганізацыяй, а прыладай у руках усходняга камуністычнага імпэрыялізму, які імкнецца да апанаваньня ўсяго сьвету. Ідучы на павадку сваіх тварцоў, яна мусіла ставіць на першым пляне пытаньні сацыяльнага характару, мусіла падгатаўляць грунт пад сацыяльную сусьветную рэвалюцыю... Сваей дзейнасьцяй „Грамада" стварыла па усім сьвеце праканаваньне, што бел. рух — гэта рух камуністычны, які трэба вішчыць агнём і жалезам... Гэтае праканаваньне дало ў рукі польскага ўраду моцны козыр у змаганьні з беларускім рухам наагул: яшчэ і цяпер польская палітыка іграе на гэтым праканаваньні эўрапэйскай публічнай апініі ў змаганьні з бел. адраджэнскім рухам, падводзячы гэты рух пад рух камуністычны.

Каб яшчэ лепш выясьніць ролю „Грамады" ў беларускім руху, падаём тут дэкларацыю аднаго з грамадаўскіх пасло Я. Сабалеўскага, каторы выступіў з „Грамады", падаючы да публічнага ведама ў гэнай дэкларацыі матывы свайго выступленьня. Паміж іншым там чытаем так: „Далейшая акцыя Грамады наагул, а мая у ёй асобна, будзе прычынай укіданьня ў польскія вастрогі лепшых беларускіх сіл. Я, будучы сынам Беларускага народу і з цэлай душы жадаючы аблягчыць у яго цяжкай долі, жадаю лепш сам цярпець у вастрозе, чым прычыняцца да запаўненьня вастрогаў беларускімі сялянамі

081530

## Рэгулямін

### для Камісіі дзеля арганізацыі Стыпэндыяльнага Фонду для беларускага студэнства.

Апрацаваны Прэзыдыумам Бел. Нац. К-ту дня 13 лістапада 1931 г., разгледжаны і зацьверджаны Агульным сходам Беларускага Нац. К-ту дня 22 лістапада 1931 г.

**I. Арганізацыя.**

§ 1. Дзеля арганізацыі Стыпэндыяльнага Фонду для дапамогі беларускаму студэнству ўтвараецца пры Беларускім Нацыянальным Камітэце адумысловая Сэкцыя Стыпэндыяльнага Фонду.

§ 2. Сэкцыя С. Ф. выдзяляецца з сяброў Б. Н. К-ту і складаецца з трох асоб: старшыні, скарбніка і сэкрэтара.

§ 3. Сэкцыя С. Ф. мае права кооптаваньня да тэхнічнага супрацоўніцтва прадстаўнікоў ад беларускага студэнства і наагул грамадзянства і разам з кооптаванымі сябрамі творыць Камісію Стыпэндыяльнага Фонду.

§ 4. Тэрыторыяльны круг дзейнасьці Камісіі С. Ф. пакрываецца з кругам дзейнасьці Б. Н. К-ту; фармальна — круг дзейнасьці Камісіі ёсьць адною з галін кругу дзейнасьці Б. Н. К-ту.

§ 5. Усе справы Камісіі С. Ф. рашаюцца звычайнай большасьцю галасоў.

УВАГА: Кооптаваныя сябры Камісіі С. Ф. маюць права дарадчага голасу.

§ 6. На дзейнасьць Камісіі С. Ф. складаецца:

a) зацікаўленьне і абзнаёмленьне грамадзянства з сучасным лёсам беларускага студэнства;

b) падшуківаньне крыніцаў дапамогі беларускаму студэнству;

c) зьбіраньне і падзел гэтаэ дапамогі.

§ 7. За сваю дзейнасьць Камісія С. Ф адказывае перад Прэзыдыумам Б. Н. К-ту, а гэты апошні — перад пленумам Б. Н. К-ту.

**II. Крыніцы даходу.**

§ 8. Матэр'яльныя сродкі Камісія С. Ф. чэрпае:

a) з аднаразовых дабравольных ахвяр;

b) з даніная грамадзян дабравольна ападаткаваўшыхся на карысьць Стыпэндыяльнага Фонду;

c) з падпісных лістоў;

d) з сталых і лётных скарбоначных зборaў;

e) з публічных лекцыяў;

f) з прадстаўленьняў, канцэртаў і іншых таварыскіх атракцый.

**III. Прызнаваньне стыпэндыяў.**

§ 9. Стыпэндыі Стыпэндыяльнага Фонду зьяўляюцца доўгатэрміновай, беспрацэнтнай зваротнай пазыкай.

§ 10. Дзеля таго, што крыніцы даходу Стыпэндыяльнага Фонду будуць зьменнымі, колькасьць і высокасьць стыпэндыяў будуць устанаўляцца Камісіяй С. Ф. ад часу да часу, аб чым будзе паведамляцца арганізацыя рэпрэзэнтуючая агул беларускага студэнства.

§ 11. Пры прызнаваньні стыпэндыяў студэнтам Камісія С. Ф. будзе кіравацца выключна: поступам у навуках кандыдата, сьцьверджаным школьнымі дакумэнтамі і матэр'яльным станам таго-ж кандыдата, пацьверджаным арганізацыяй рэпрэзэнтуючай агул беларускага студэнства.

Вільня, 22.XI.31.

**Беларускі Нацыянальны Камітэт.**

## Ab haspadarcy.

### Rybnaja haspadarka. (2)

*d) Niapoŭnaja rybnaja haspadarka.*

Pry hetym kirunku, pracy haspadaru nia treba viaści ŭ siabie stavy roznych sartoŭ i hłybini, nia treba hadavać ryby roznaha vieku, nia treba na rybu kłaści hetulki starańniaŭ, času i pracy, kab paśla ad hetaha ciarpieła ziemlarobskaja haspadarka: treba mieć tolki adzin ci niekalki staŭkoŭ adnaho hatunku (h. zv. hałoŭnyja, abo karpovyja stavy) na toje, kab što hodu naviasnu puskać u ich, jak tolki vada abahrejecca da 10oC, peŭny lik hadaŭlanaj ryby (adna — ci dvuletniaj). Štuka takoj hadaŭlanaj dvuletniaj ryby zvyčajna važyć 300 gram (try čviortki funta, abo — funt biaz čviortki) i za viasnu dy leta da vosieni ŭ dobrym stavie musić pabolšyć svaju vahu da paŭtara kilohrama (čatyry funty biaz čviortki); znača za leta kožnaja ryba pavinna prybyć na vazie 3 funty.

Dziela taho, što kuplańnie dvuletniaj hadaŭlanaj ryby zvyčajna doraha abchodzicca (jana daražejšaja, čymsia rynkovaja kuchonnaja ryba), niekatoryja haspadary-rybaki kuplajuć zamiest dvuletniaj — adnaletniuju hadaŭlanuju rybu, h. zv. n a r y b a k i hadujuć z jaho ŭ svaich stavoch nasampierš dvuletniuju hadaŭlanuju rybu, zimoj častku ryby pradajuć, a častku pakidajuć da druhoha hodu. Takim čynam z adnaletniaj stanovicca hadoŭla dvuletniaj.

Inšyja ŭznoŭ haspadary, dla źmienšańnia koštaŭ hadoŭli ryby, trymajuć u vadnym stavie adna — i dvuletni maładniak adnačasna. Uvosieni rynkovuju (tryletniuju) rybu pradajuć, a dvuletniuju pakidajuć na nastupny hod. U nastupnym hodzie dakuplivajuć tolki adnaletkaŭ i ŭpuskajuć ich u hety-ž staŭ da dvuletkaŭ. I tak kruhom. — Usio heta adnak tolki vychad z biady i dobry haspadar zaŭsiady pavinien staracca inšym sposabam źmienšyć košty zakupu dvuletniaj hadaŭlanaj ryby ale źmienaŭ praviłaŭ samaj hadoŭli pavinien unikać.

Nasadžyvańnie viasnoj u hałoŭnyja (karpovyja) stavy dvuletniaj, abo adnaletniaj hadaŭlanaj ryby nazyvajecca z a r y b l a ń n i e m stavu. Kolkaść nasadžyvanaj hadaŭlanaj ryby zaležа ad jakaści i vialičyni samoha stavu i vynosić — pavodle A. Kreuza—na $^1/_4$ ha (2500 kv. m., niamiecki morh) płoščy stavu ad 8-mi da 84-och štuk 300 gramovych dvuletnich karpaŭ. — Pry adnačasnym trymańni ŭ tym-ža stavie adna — i dvuletnich karpaŭ, dajuć tudy, pavodle taho-ž A. Kreuza, na $^1/_4$ ha płoščy stavu ad 7-mi da 72-ch štuk adnaletniaha i ad 6-ci da 63-ch štuk dvuletniaha karpa. Zaryblańnie stavoŭ možna pravodzić tolki tady, kali vada ŭ stavoch nahrejecca da 10oC (m-c travień), vada-ž u hetyja stavy napuskajecca, jak tolki ziamla admierźnie i abahrejecca.

Tak ci hetak vyhadavany rybiny tavar vyłaŭlivajecca z karpavych stavoŭ u treciuju vosień jahonaha žyćcia i pastupaje ŭ prodaž abo zaraz-ža, abo zimoj, abo až naviasnu. Uvosieni cana ryby najnižejšaja, ale pierachavać rybu na zimu, a tymbolš — da viasny, moža tolki toj, chto maje h. zv. zimachovy (małyja, ale najmienš dva metry hłybokija, zacišnyja stavy). U hetych stavoch, z abnižeńniem temperatury, ryba papadaje ŭ śpiačku, ničoha nia jeść i patrabuje tolki pavietra, kab mahčy dychać.

*e) Ab rybnych stavoch ahułam.*

Stavam — pavodle B. Benecke — nazyvajem vody ŭsiakaj jakaści, jakija možna asušyć pavodle voli. — U rybnaj haspadarcy znajem až šešć vidaŭ stavoŭ. 1. N e r a s t o v y j a, abo i k r a m i o t n y j a stavy, dzie ryba kładzie ikru i dzie z ikry vychodziać maładyja rybki (małoki). Hetyja stavy musiać być vielmi miełkija, bo tolki 20—30 cm. uhłybki, kab chutka mahli nahravacca. Łavić rybu padčas nerastu (m-cy travień—lipień) zakonam zabaroniena. 2. Z pałožanaj i zapłodžanaj ikry za 4—8 dzion vypłodžyvajecca rybka i za dalšych 4—5 tydniaŭ ( jak tolki źniknuć u małokaŭ h. zv. žaŭtkovyja miašočki) pieravodzicca zvyčajna ŭ h. zv. n a r y b k o v y j a, abo razsadnyja stavy, hłybokija ad 50 cm. da 1 metra. 3. Adnaletniaja ryba trymajecca ŭ h a d a ŭ l a n y c h stavoch, adzin až paŭtara metra hłybokich, a 4. dvuletniaja hadaŭlanaja ryba nasadžyvajeca ŭ h a ł o ŭ n y j a, abo k a r p o v y j a stavy, dachodziačyja ŭhłybku da paŭtara až dvuch metraŭ. 5. Tam, dzie chočać hadavać karpaŭ staršych, jak try hady, sadziać ich jašče ŭ n a h u l n y j a stavy, padobnyja da papiarecnich. 6. Na zimu najlepš kožny vid (uzrost, viek) ryby asobna sadzić u z i m o v y j a, hłybokija stavy. Apräča taho ryba vyłaŭlenaja z stavoŭ i pradznačanaja na prodaž trymajecca taksama ŭ asobnych basejnach, s a d k a c h.

Jak skazana było ŭžo vyšej, ŭsie vidy stavoŭ mohuć mieć tolki h. zv. p o ŭ n y j a rybnyja haspadarki. Dla hetkich haspadarak M. v. d. Borne ŭ prybliznaści abličyŭ, što kali chočać, kab ryba z kancom pieršaha hodu važyła 100g (čvierć funta), z kancom druhoha — 400g (adzin funt) i z kancom treciaha — adzin kilohram (paŭtracia funta), dyk suadnosiny abšaru stavoŭ nerastovaha: hadaŭlanaha i: hałoŭnaha (karpovaha) pavinny raŭniacca suadnosinam 1: 4: 10. Pry ŭzroście-ž ryby ŭ 1-šym hodzie da 50 g, u 2-him — da 450 g i ŭ 3-im - da 1 kg, tyja-ž suadnosiny pavinny byli-b raŭniacca suadnosinam 1: 9: 20. Heta znača, što na kožny kvadratovy metr płoščy nerastovaha stavu: u pieršym vypadku treba było-b mieć 4 kv. m. hadaŭlanaha i 10 kv. m. hałoŭnaha stavu, a ŭ druhim — 9 kv. m. hadaŭlanaha i 20 kv. m. hałoŭnaha stavu.

Što datyča zapatrabavańnia i ŭborystaści zimovych stavoŭ, dyk, pavodle J. Arnolda, pry hłybini stavu 1.80 m., na 1 kv. m. płoščy vady dajecca adnaletnich karpaŭ 25—35 štuk, dvuletnich — 12—15 štuk, kupieckich — 10—15 štuk i raspładovych — 6—8 štuk.

*inž. A. K.*

---

і праз гэта да зьніштажэньня сем'яў, якія асталіся на волі" (Пасол Сабалеўскі перад абвяшчэньнем гэтай дэклярацыі сядзеў 9 месяцаў у турме, потым увайшоў у сойм як кандыдат па вачэньні аднаго з пaслоў, а пасьля разьвязаньня сойму ў 1928 г. прасядзеў блізу 3 гады ў турме).

„Беларуская Грамада — чытаем далей у дэклярацыі пасла Сабалеўскага — вяла сваю працу пераважна ў кірунку ўсьведамляньня беларускіх гушчаў з палітычнага пункту гледжаньня, затое вельмі мала звярочвала ўвагі на рэчы важнейшыя для беларускай вёскі: на нацыянальнае ўсьведамленьне, на культурна-асьветную працу і на палепшаньне гаспадарчага палажэньня беларускага народу." („Сял. Ніва" № 70.1927 г.).

Гэтая дэклярацыя некалі грамадаўскага дзеяча найлепш сьведчыць аб характары дзейнасьці Грамады.

Якія-ж былі далейшыя падзеі „Грамады" пасьля зьліквідаваньня яе польскімі ўладамі?

Пад ударамі польскага ўраду, а так-жа на аснове вутраной дыфэрэнцыяцыі „Грамада" пачала разваляваца. Левае крыло ўступае адкрыта ў камуністычныя рады і засноўвае, як на соймавым грунце, так і на абшары Зах. Беларусі групу „Змаганьне" (паслы Крынчык, Дварчанін, Гаўрылік, Грэцкі, Валынец), а правае крыло творыць полёнофільскую групу. На чале гэтай групы, якая паставіла на парадку дня асягненьне практычных мэт у Польшчы (утрыманьне Віленскай бел. гімназіі, бел. музэю, Дабрадзейнага Т-ва і г. д.) сталі Антон Луцкевіч і Р. Астроўскі, якія сарганізавалі нават цэнтр беларускай полёнофіліі, так зв. „Цэнтрасаюз." Полёнофілы, вышаўшыя з „Грамады," стараюцца такжа звольніць пасаджаных у турму грамадаўскіх паслоў і выдатнейшых дзеячоў з тэй надзеяй, што тыя стануць поруч з імі і гэтым самым узмацуюць рады полёнофілаў. Першае ім удаецца: паслы (апроч Валошына) былі звольнены, разам з імі яшчэ некаторыя дзеячы (Акінчыц, Бурсэвіч), але што датыча другога, то тут наступіла поўнае расчараваньне. Паміж звольненымі грамадаўцамі пашла глыбокая дыфэрэнцыяцыя —паслы Рак-Міхайлоўскі і Мятла ўцякаюць у саветы, а Ф. Акінчыц, быўшы юрысконсульт пры Цэнтр. Камітэце „Грамады," спачатку быў прыстаў да групы Луцкевіча і Астроўскага, але потым, пасварыўшыся з імі, стварыў новую „групу" полёнофілаў, якая вельмі варожа выступіла проціў сваіх даўнейшых прыяцеляў Луцкевіча і Астроўскага. Акінчыц у двух аднадвёўках („Бел. Праўда" і „Праўда") пачаў дэмаскаваць іх, закідаючы ім розныя маральнага і матэр'яльнага характэру праступкі, як з часаў грамадаўскіх, так і з часаў іхнага полёнофільства. Характэрна, што ані Луцкевіч, ані Астроўскі на такія абвінавачаньні не зарэагавалі адклікаiньнем да дзяржаўнага, ці хаця-б грамадзкага суду.

Гэтакім падзелам і гэтакай калатнёю скончылася дзейнасьць „Грамады." З гэтага відаць, якія няпэўныя і бяспрынцыпныя людзі былі ў даўнейшай „Грамадзе," што патрафілі ў працягу некалькіх гадоў перайсьці „ад белага арла к красному знамені" і наадварот! Цяпер беларуская полёнофілія, або так зв. беларуская санацыя, перажывае востры вутраны крызіс, які „Б. Крыніца" (№ 22.31) справядліва называе барацьбою за месца пры карыце. Хто пераможа у гэтай барацьбе — ці група Луцкевіча і Астроўскага, ці група Акінчыца, згадаць трудна, але здаецца той, хто будзе карысьнейшым для сваіх „хлебадаўцаў."

„Беларуская Крыніца" ў м-цы сьнежні выйдзе: 6, 15 і 23-га дня.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел.р. Друк. ім. Ф Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.